# СВАБОДА

№12 29 сакавіка — 3 красавіка 1994 г.

Кошт 50 рублёў


# Навошта Кебічу мыльніца за 60 даляраў?

**Падобна на тое, што вышэйшае беларускае кіраўніцтва неўзабаве будзе мець магчымасьць адпачываць гэтак жа шыкоўна, як арабскія шэйхі.**

Дзеля гэтага ў Сочы плянуецца рэканструяваць 4-паверхавы будынак водагразелякарні, якая належыць санаторыі «Беларусь». Гэты будынак мяркуецца пераабсталяваць і зрабіць у ім шыкоўныя апартамэнты для адпачынку некалькіх асобаў зь сем'ямі.

Цяпер Саўмін шукае фірму, каб даручыць ёй выкананьне гэтай важнай працы. У прыватнасьці, як даведаўся карэспандэнт СВАБОДЫ, вядуцца перамовы з кіпрскаю фірмаю «Vinora Trading Ltd». Яна ўжо падала свой праект рэканструкцыі і каштарыс у 1 млн. 237 тысяч даляраў. Чаму так дорага? А як вы хацелі? Рэч у тым, што адна мыльніца каштуе 60 даляраў, а, напрыклад, кубачак для зубной шчоткі — 50 даляраў... За раскошу трэба плаціць! Зразумела, што плаціць давядзецца нам з вамі.

Мікола ГРЫНЯВІЦКІ



## Грыб падпісаўся

Старшыня Вярхоўнага Савету М.Грыб падпісаў учора, 28 сакавіка, новую Канстытуцыю Рэспублікі Беларусі. Сёньня яна перададзена ў афіцыйныя газэты і празь месяц з дня публікацыі ўступіць у дзеяньне (хутчэй за ўсё зь 1 траўня).

«Шкада, што пяро не залатое», — сказаў генэрал, падпісваючы Канстытуцыю. Пасьля Грыб узяў у рукі сувэнірнае выданьне Канстытуцыі Расейскай Фэдэрацыі і, патрасаючы ёю, пачаў гаварыць, што трэба, каб «нашая Канстытуцыя была ў кожным доме».

П.П.

**TV ПРАГРАМА**

## Хабар будзе браць урад

**Савет Міністраў даў дазвол уязджаць на тэрыторыю Беларусі без чаргі. Але за гэта трэба будзе заплаціць далярамі.**

Кажуць, што беларускія памежныя службы спэцыяльна ўтваралі на нашых межах чэргі, каб спаганяць хабар за магчымасьць хутка патрапіць у Рэспубліку Беларусь. Але «халява» скончылася, і цяпер хабар будзе браць урад. 18 сакавіка таварыш Кебіч падпісаў Пастанову Саўміну №160, паводле якой кожны замежны грамадзянін можа перасекчы нашую мяжу без чаргі, заплаціўшы за гэта 50 USD. Саўмін пастанавіў, што 35% гэтай сумы застаецца ў распараджэньні памежнікаў, астатняе ж ідзе ў бюджэт. Кебіч таксама дазволіў памежнікам пакідаць сабе 35% сканфіскаванай кантрабанды.

Пятро ПАНКРАТОВІЧ

## Бальцаровіч у Менску

**27 сакавіка ў Менску ў Беларускім гуманітарным адукацыйна-культурным цэнтры адбыўся навукова-практычны сэмінар «Шляхі выхаду з эканамічнага крызысу дзяржаваў Усходняй і Цэнтральнай Эўропы». З асноўным спавешчаньнем выступіў вядомы польскі рэфарматар Лешак Бальцаровіч.**

Калі ў Бальцаровіча спыталі: колькі, на ягоную думку, у працэсе рэформаў павінна зьмяніцца ўрадаў, каб маглі ажыцьцявіцца радыкальныя зьмены, прафэсар лякані́чна адказаў, што вельмі важна зьмяніць першы ўрад, бо інакш нічога не атрымаецца.

На здымку: Л.Бальцаровіч




ГОД ЗАСНАВАНЬНЯ 1902
ВЫХОДЗІЦЬ З 1990

Галоўны рэдактар
**Ігар ГЕРМЯНЧУК**

Заснавальнік **Павал ЖУК**

Выдавец
**«Газэта СВАБОДА», Ltd.**

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
**220088, Менск, вул.Іванаўская, 56**


## Магілёўскія ўлады падтрымліваюць прыднястроўскіх сэпаратыстаў

**Тымчасам як унутрыпалітычная сытуацыя ў Малдове пачала спакваля нармалізавацца, Магілёўскі аблвыканкам вырашыў падліць смалы ў агонь і накіраваў у Тыраспаль афіцыйную дэлегацыю з мэтай «наладжваньня гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспублікай».**

Як вядома, ніводная краіна сьвету дагэтуль не прызнала сэпаратысцкае ўтварэньне на левым беразе Днястра ў якасьці самастойнага палітычнага і гаспадарчага суб'екту. Кіраўніцтва Магілёўскага аблвыканкаму, на чале якога стаіць вядомы «інтэр» Мікалай Грынёў, вырашыла, пэўна, хоць гэткім чынам трапіць у гісторыю. Аднак справа скончыцца, відаць, скандалам.

Як заявіў карэспандэнту СВАБОДЫ дарадца пасольства Малдовы ў Менску Думітру Мунцяну, «візыт магілёўскай афіцыйнай дэлегацыі ў Тыраспаль, мінуючы законныя дзяржаўныя органы Рэспублікі Малдовы, — учынак у дачыненьні да нас у найвышэйшай ступені нетактоўны і непрыгожы. Гэта можна расцэньваць як фактычнае прызнаньне ПМР». Д.Мунцяну паведаміў, што 22 сакавіка пасольства Малдовы накіравала запыт у МЗС Беларусі з просьбаю даць афіцыйнае тлумачэньне гэтаму факту.

Сяргей ГРЫБ



**На мінулым тыдні міністар абароны ЗША Ўільям Пэры сустрэўся са сваім беларускім калегам Паўлам Казлоўскім у будынку МА Беларусі на вуліцы Камуністычнай. Цікава, ці стане гэтая сустрэча апошняй для сп. Казлоўскага, як стаў апошнім для Шушкевіча візыт Клінтана?**

### Прызначэньне

Былы прадстаўнік Беларусі пры ААН Генадзь Бураўкін 18 сакавіка быў прызначаны на пасаду намесьніка міністра культуры і друку. Каго Кебіч пасадзіць у крэсла міністра — пакуль невядома.

## Пракуроры таксама гінуць

**На мінулым тыдні ў Горадні на працягу трох дзён знаходзіўся Генэральны пракурор Васіль Шаладонаў.**

Ён папярэдне прадставіў новага намесьніка пракурора вобласьці сп.Парамонава, які ўзначальвае аддзел агульнага нагляду пракуратуры. Зацьвердзіць яго на пасадзе павінна калегія Рэспубліканскай пракуратуры, якая мелася адбыцца 28 сакавіка.

Былы намесьнік гарадзенскага пракурора сп.Прошын нядаўна трагічна загінуў пад коламі цэмэнтавоза.

А.М.

## Чытайце, дзеткі, «Праўду»

**Адміністрацыя Менскага аб'яднаньня індустрыйнага домабудаваньня выпісала ўсім сваім дзіцячым садкам газэту «Праўда».**

На беларускія дзіцячыя часопісы грошай не хапіла.

Галіна АГАЛАКАВА


© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

## Студэнцкая салідарнасьць

**На філфаку БДУ 24 сакавіка адбылася вечарына, арганізаваная Задзіночаньнем беларускіх студэнтаў.**

Яна была прысьвечана славутаму Парыскаму траўню, калі ў 1968 г. студэнты Сарбонскага ўнівэрсытэту захапілі адзін з дэканатаў у адказ на арышт некалькіх сваіх калегаў. Лёзунгі й ідэі бунтоўных студэнтаў падхапіла тады моладзь 50 краінаў сьвету.

Вечарына прайшла з паказам відэафільму пра моладзь Парыскага траўня.

**Ціна КЛЫКОЎСКАЯ**

## Дом для польскага консульства

**Гарадзенскія ўлады маюць прапанаваць пад польскае консульства невялікую двухпавярховую камянічку на вул.Чапаева.**

Яна выстаўлялася нядаўна на першым гарадзкім аўкцыёне за 50 млн. руб., але яе ніхто не купіў. Дом лядашчы, і для ягонага рамонту патрэбныя немалыя грошы. Пакуль, аднак, невядома, ці захоча консульства Польшчы разьмясьціцца ў гэтым будынку.

**А.С.**

## Кебіча чакае турма

**«Я падазраю, што ўсе злоўжываньні ў вышэйшых эшалёнах улады праводзяцца са згоды Старшыні Саўміну Вячаслава Кебіча», — заявіў Лукашэнка карэспандэнту «Інтэрфакса».**

На ягоную думку, «калі Кебічу ня ўдасца стаць прэзыдэнтам, дык яму і многім зь ягонай каманды давядзецца сесьці ў турму». Адкрыў Амэрыку!

**М.Г.**

## І вечны бой...

**На традыцыйнай чарговай нарадзе аграрнікаў Слонімскага раёну, дзе выпрацоўвалася стратэгія і тактыка сёлетніх веснавых палявых работ, старшыня мясцовай управы сельскай гаспадаркі Іван Кахноўскі запэўніў абласных чыноўнікаў, што сяляне настроеныя па-баявому змагацца зь цяжкасьцямі.**

Аднак як ім гэта ўдасца, калі да сяўбы ў раёне назапашана каля 30% тукаў, 35% бэнзыну і 40% дызэльнага паліва ад неабходнага. Акрамя таго, шэф абласной сельгасхіміі Радавец папярэдзіў прысутных, каб яны не спадзяваліся на дапамогу "старэйшага брата". Бо расейскі ўрад, сказаў ён, выдаў загад, які забараняе рэалізацыю ўсіх відаў мінэральных угнаеньняў у былыя саюзныя рэспублікі да таго часу, пакуль не адсеюцца расейскія сяляне.

**В.В.**

# Выстава да галоўнага сьвята

**Сёлетняе сьвята 25 Сакавіка сталіца адзначыла ўрачыстым адкрыцьцём выставы творчай суполкі «Пагоня», прысьвечанай Дню Волі.**

У Палацы мастацтваў было людна як ніколі; ва ўсякім разе, гардэроб імгненна перапоўніўся, і людзі мусілі насіць палітоны з сабой. Замалы гардэроб аказаўся не адзінаю праблемаю, зь якою сутыкнуліся арганізатары: акурат перад Пазьняковаю прамоваю раптоўна адключылася гукаўзмацняльная сыстэма, што, натуральна, выклікала хвалю традыцыйных жартаў. Але кандыдат мастацтвазнаўства Зянон Пазьняк «узяў» аўдыторыю і без узмацненьня. На адкрыцьці прамаўлялі мастакі Мікола Купава, Алесь Марачкін (вершам!), гісторык Анатоль Грыцкевіч. Выступілі гурт «Ліцьвіны» й дзіцячы фальклёрны тэатар «Госьціца».

Канцэптуальна скампанаваная выстава заняла другі паверх Палаца мастацтваў. Цэнтар экспазыцыі — памятная бронзавая шыльда аўтарства скульптара Алеся Шатэрніка *(на здымку)*, якую грамадзкасьць другі год дамагаецца замацаваць і ўрачыста адчыніць на «БНРаўскім» доме на рагу Скарынавага праспэкту й вуліцы Валадарскага, але гэтаму пярэчаць гарадзкія ўлады.

Над шыльдаю — буйныя жывапісныя творы Алеся Марачкіна зь немалой ужо нізкі постацяў беларускага Адраджэньня: партрэты Алега Бембеля, Зянона Пазьняка, Міколы Ермаловіча, Міколы Статкевіча й Алеся Пушкіна. Паабапал — вялікія батальныя палотны, прысьвечаныя Аршанскай (Генрых Ціхановіч) і Вульскай (Алесь Філіповіч) перамогам. Ёсьць і традыцыйная для сакавіцкіх выставаў інсталяцыя. Гэтым разам маем мэтафарычнае (і просталінейнае) процістаўленьне лядашчага «сакратарскага крэсла», на спружыны якога панавешаны сымбалі камунізму, і велічнага княскага трону з кнігай і шабляй на ім. Наагул выстава вялікая, жанрава й стылёва разнастайная. Не бракуе графікі, скульптуры.

Экспазыцыя будзе працягвацца два тыдні.

**І.С.**

**На здымку:**

**Адкрыцьцё выставы «Адраджэньне-94»**

# Шэсьце забаранілі

**Берасьцейскі гарвыканкам не дазволіў рэгіянальнай Радзе БНФ праводзіць сьвяточнае шэсьце ў гонар 25 Сакавіка.**

«Улічваючы складанае палітычнае, сацыяльна-эканамічнае становішча ў горадзе і тое, што шэсьце можа прывесьці да непажаданых вынікаў... выканкам вырашыў забараніць яго правядзеньне», — гаворыцца ў адказе гарадзкіх уладаў.

**П.П.**




## Гэтая небясьпечная мяжа

За апошні час пракуратураю Гарадзенскай вобласьці сумесна з КДБ на беларуска-польскай і беларуска-летувіскай межах затрымана каля двух дзясяткаў памежнікаў і мытнікаў, якія падазраюцца ў хабарніцтве.

**С.М.**

## Наваградак зважае на Кембрыдж

**У верасьні ў Наваградку мае адчыніцца філія Беларускага ўнівэрсытэту культуры. Напачатку тут будуць навучаць дэкаратыўна-прыкладному мастацтву. Пастанавіў адчыніць філію Гарадзенскі аблвыканкам.**

Пачынае, такім чынам, зьдзяйсьняцца задума нашага замежнага суродзіча Барыса Кіта, вядомага ў сьвеце акадэміка астранаўтыкі, выпускніка Наваградзкай беларускай гімназіі. Спадар Кіт перакананы, што ідэя існаваньня ўнівэрсытэту ў невялікім горадзе цалкам плённая. Пра гэта сьведчыць хоць бы сусьветная слава Гайдэльбэрга або Кембрыджа з Оксфардам. Ён таксама прапануе будаваць у Наваградку эўрапейскі ўнівэрсытэт з выкарыстаньнем амэрыканскага досьведу.

Наваградак мае глыбокія культурныя традыцыі, пачынаючы ад каляраваньня тут Міндоўга ў XIII стагодзьдзі. Горад меў Магдэбурскае права, быў цэнтрам ваяводзтва, у ім разьмяшчалася рэзыдэнцыя праваслаўнага мітрапаліта Вялікага Княства Літоўскага. Тут перапісвалі й стваралі арыгінальныя кнігі. У 1539 г. адчынілася першая гімназія, пазьней — кляштарная базылянская школа, а ў 1714 г. быў заснаваны езуіцкі калегіюм. Урэшце, славы Наваградку дадаў Адам Міцкевіч.

**А.С.**

## Пракурор чакае адказу

**СВАБОДА ўжо пісала, што пракурор Гарадзенскай вобласьці Цярэшчанка патрабуе паўторна склікаць сэсію Гарадзенскага гарсавету, каб прыняць захады да галоўнага архітэктара Лытава.**

На гэтым тыдні павінна адбыцца паседжаньне Прэзыдыюму гарадзкога савету, на якім будзе прынята рашэньне адносна пратэсту пракурора.

Нядаўна пракуратура сканфіскавала на карысьць гарадзкіх уладаў дзьве пабудовы, узьведзеныя каапэратывамі незаконна, але з дазволу сп.Лытава. Цікава, што адна зь іх — двухпавярховая прыбудова да панэльнага дома на вул.Болдзіна, у якім жыве сам пракурор вобласьці.

**М.М.**

## Замест воўчай галавы — шасьцярэнькі?

**Ваўкавыск атрымаў Магдэбурскае права досыць рана — ў 1503 годзе. Абавязковым атрыбутам горада з самакіраваньнем быў герб. Вядомы ваўкавыскі герб з выяваю воўчай галавы ў блакітным полі ўжываўся, як лічаць дасьледнікі, менавіта ад таго часу.**

Гарадзкія дэпутаты, аднак, вырашылі, што каралеўскі прывілей сёньня ня мае моцы. На апошняй сэсіі гарадзкога Савету пытаньне аб зацьверджаньні герба было ўпісана ў парадак дня. Абмеркаваньне адбывалася надзвычай бурна. Адным герб падабаўся, іншыя зацята змагаліся за новы, «больш адпаведны сучасным эстэтычным густам». Але дэпутаты нічога ня вырашылі, пакінулі пытаньне на «дапрацоўку».

**А.С.**

## Італьянскі ключ да ваўкавыскага замка

**На Беларусі добра вядомыя сваёй кепскай якасьцю ваўкавыскія дзьвярныя замкі.**

На заводзе мэталічных вырабаў, дзе іх выпускаюць, вырашылі палепшыць справу пры дапамозе сумеснага прадпрыемства «Прэфэрбел». Грошы — нашыя, абсталяваньне — італьянскае. Неўзабаве, аднак, выявілася, што яно створана без дазволу ўласьніка заводу — канцэрну «Белмясцпрам». Не давала згоды і 2/3 працаўнікоў, як павінна быць паводле калектыўнай дамовы між адміністрацыяй і калектывам. Далей аказалася, што па-за СП засталіся адно дапаможныя службы, а дзяржаўная маёмасьць — будынкі, абсталяваньне — улучана ў статутавы капітал. Частка галоўнага гмаху таксама адыходзіла да сумеснага прадпрыемства, а другая частка — у 10-гадовую арэнду. Абурыла рабочых і тое, што італьянцы мелі паставіць састарэлае абсталяваньне (хоць яно, мабыць, усё адно навейшае за наша). Скончылася тым, што сабралася канфэрэнцыя працоўнага калектыву і бальшынёй галасоў выказалася за недавер дырэктару.

**Вацлаў МАЛЕВІЧ**

## На месцы Леніна мог быць Лукашэнка

**Магілёўскія камуністы зноў пратэстуюць. З прычыны таго, што на мінулым тыдні ў горадзе зьнік лёзунг «Пусть живет в веках имя великого Ленина».**

Гэты 100-мэтровы надпіс, выкананы драўлянымі літарамі, быў зьнесены на загад гарадзкіх уладаў рабочымі камунальнай службы. Неактуальна.

Камуністы падазраюць, што гэтую ідэю чыноўнікам гарвыканкаму мог падказаць нехта з кіраўніцтва мясакамбінату, насупраць якога быў неўміручы лёзунг. Камуністы абвінавачваюць адміністрацыю мясакамбінату ў «каньюктуршчыне». У якасьці доказу яны прыводзяць факт, як пасьля правалу жнівеньскага (1991 г.) путчу з будынка мясакамбінату адразу зьнікла слова «партыя». Яго замянілі іншым словам. Лёзунг стаў гучаць больш актуальна: «Задачи, поставленные народом — выполним!»

Злыя магілёўскія языкі сьцьвярджаюць, што лёзунг «Пусть живёт в веках...» таксама спрабавалі актуалізаваць — замест Леніна паставіць іншае прозьвішча. Але Кебіч не падышоў, бо ўсіх расчараваў сваімі казкамі пра «зону». Грыб хоць і генэрал, аднак сур'ёзна яго не ўспрымаюць. Вось зямляк Лукашэнка!.. Аднак паглядзелі, палічылі і расчараваліся — на жаль, у ягоным прозьвішчы аказалася дзевяць літараў, а на фанэрным лёзунгу магло зьмясьціцца толькі шэсьць.

**Сяргей ГРЫБ**



© PDF: Kamunikat.org 2010

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Міністар загадаў маўчаць

**Зь Міністэрства ўнутраных справаў у рэдакцыю СВАБОДЫ неафіцыйным шляхам патрапіў цікавы дакумэнт: рапарт на імя міністра Ул.Данько, падпісаны начальнікам сакратарыяту МУС В.Грыняком.**

Палкоўнік Грыняк рапартуе міністру Данько:

«Апошнім часам, у сувязі са зьменамі ў кіраўніцтве МУС, у апараце міністэрства ўзмоцнена падаграюцца чуткі пра магчымыя кадравыя перастаноўкі. У працоўны час у службовых кабінэтах афіцэры і вольнанаймання супрацоўнікі падоўгу абмяркоўваюць: — хто стане намесьнікам ці першым намесьнікам міністра; — хто будзе прызначаны першым намесьнікам начальніка акадэміі і начальнікам аддзелу кадраў гэтай навучальнай установы і г.д.

Такая «заклапочанасьць», натуральна, ня йдзе на карысьць справе, бо забірае многа працоўнага часу. Акрамя таго, стварае перадумовы для працёку службовай інфармацыі.

У дадзенай сытуацыі, мяркую, неабходна патрабаваць ад кіраўнікоў структурных падразьдзелаў прыняць самыя сур'ёзныя захады для спыненьня беспрадметных размоваў, якія не адносяцца да кампэтэнцыі асноўнай катэгорыі супрацоўнікаў, для падвышэньня пільнасьці і ўмацаваньня службовай дысцыпліны асабовага складу».

Міністар напісаў на рапарце грозную рэзалюцыю: «Прашу навесьці парадак».

П.П.

# Нават савецкая ўлада супраць Кебіча

**21 сакавіка сэсія Пінскага гарадзкога Савету прыняла зварот з патрабаваньнем адстаўкі ўраду Кебіча.**

За гэта прагаласавала 59 з 72 прысутных дэпутатаў. Яны лічаць, што каманда Кебіча, якая завяла беларускую эканоміку ў тупік, абсалютна ня здатная ажыцьцявіць рынкавыя рэформы. Пінскія дэпутаты патрабуюць ад Вярхоўнага Савету сфармаваць кампэтэнтны пераходны ўрад.

Як вядома, намэнклятурная частка Пінскага гарсавету двойчы зрывала сэсію, штучна ўтвараючы адсутнасьць кворуму. Каб супакоіць бунтарны гарсавет, у Пінск прыяжджаў нават намесьнік прэм'ера Сяргей Лінг.

Аднак уратаваць Кебіча не ўдалося. З трэцяга заходу дэпутаты прагаласавалі за адстаўку. Гэта першы выпадак, калі супраць Кебіча афіцыйна выказваецца мясцовая ўлада.

**Мікола ГРЫНЯВІЦКІ**



**Лепшыя людзі рэспублікі ў чаканьні новых пасадаў**

**На здымку (зьлева направа) генэралы: І.Карповіч — начальнік Менскай абласной міліцыі, Б.Алданаў — шэф міліцыі Магілёўскай вобласьці, В.Казлоў — начальнік беларускай транспартнай міліцыі, Г.Сівіцкі — начальнік Берасьцейскага УУС.**

# Як летувіская служба бясьпекі рабіла аблаву на мяжы

Адзін мой прыяцель-гісторык сабраўся наведаць віленскія архівы. Напачатку ўсё здавалася нескладаным. Паколькі зь 1-га сакавіка летувісы ўзаконілі візавы рэжым, наш навуковец зателефанаваў да начальніка гарадзенскага КПП і пацікавіўся, дзе і як можна набыць тую візу. Яго супакоілі: купіш на мяжы.

Віленскі цягнік адыходзіць з Горадні ўначы, у 2.30. Пасьля трэцяй гадзіны — першы прыпынак за мяжой — Кабялі. Пашпарты спраўджаў жаўнер-памежнік. Ніхто з пасажыраў ня меў візаў, а ў Кабялях іх таксама не давалі. Таму амаль усіх высадзілі на пэрон, і небаракі нават не зьмясьціліся ў невялікай пачакальні. Майго сябру, мабыць, жаўнер пашкадаваў, бо той паказаў камандзіроўку і растлумачыў, куды і навошта едзе.

Наступная была станцыя Марцінканцы. Але перад тым цягнік толькі на хвілінку спыніўся проста ў лесе. У вагон увайшлі тры жаўнеры, адзін зь іх з рацыяй, і афіцэр. Усе яны мелі іншыя нашыўкі на рукавох. Ня ўбачыўшы ў пашпарце майго сябры візы, летувіскі капітан пачаў у яго выпытваць, каму і колькі даляраў ён даў, каб ня высадзілі зь цягніка? Выявілася, што гэтае начы служба бясьпекі правярала, наколькі сумленна працуюць памежнікі. Афіцэр патлумачыў гарадзенцу, што за бязьвізавы побыт у Летуве яму пагражае штраф ад 200 да 500 літаў і затрыманьне ў пастарунку, пакуль ня будуць унесеныя гэтыя грошы. Наш гісторык «цьвёрда трымаўся», ажно летувіс яму нарэшце паверыў і загадаў тады напісаць тлумачэньне. На чыё імя? Капітану контрвыведкі — і ён назваў сваё прозьвішча.

Майго сябру і яшчэ трох гарадзенскіх кабет пасадзілі ў вайсковую машыну і павезьлі назад у Кабялі. Высьветлілася, што візы тут не прадаюцца ўжо тры дні. Адна з кабет, дарэчы, паказала на жаўнера, якому дала грошы, каб не высаджваў з вагона. Гісторык дамогся, каб начальнік заставы пазначыў на ягоным камандзіровачным пасьведчаньні, што ён выгнаны з тэрыторыі Летувы, бо ня меў візы.

Уся карысьць начной прыгоды была ў тым, што мой сябра даведаўся: візу можна набыць, апроч летувіскага пасольства ў Менску, на чыгуначнай станцыі ў Друскеніках або на памежным аўтапераезьдзе. Праз некалькі дзён ён паехаў туды машынаю. Нашыя памежнікі на КПП у Прывалцы (на поўнач ад Горадні) наказалі яму: як вернесься, усё распавядзеш, бо яны таксама паняцьця ня мелі пра тыя візы.

На летувіскім КПП жаўнер пратрымаў яго ажно тры гадзіны, нібыта дамаўляўся па тэлефоне з афіцэрам. Потым праштампаваў у пашпарце 10-дзённую візу за 7 даляраў і ўзяў у дадатак яшчэ 10 «дольцаў» за тое, што не адзначыў у ёй перасячэньне мяжы, як належыць зрабіць... Калі гарадзенскі навуковец нарэшце зноў сеў у цягнік і апынуўся ў Кабялях, дык летувіс-памежнік вельмі зьдзівіўся, прагледзеўшы ягоны пашпарт. Ён упершыню сутыкнуўся з належна аформленымі дакумантамі.

Карацей кажучы, візавы ўезд у краіну летувісы зрабілі былі па-савецку: каб адныя пакутавалі, а іншыя з гэтага мелі капейчыну. Але халява скончылася. Папрацавала служба бясьпекі. Цяпер, каб зьезьдзіць у суседнія Друскенікі, гарадзенцам давядзецца напачатку наведацца ў Менск па візу. 22 сакавіка ў чарзе па яе трэба было чакаць чатыры дні.

**Сяргей АСТРАЎЦОЎ**

# Колькі плоцяць беларускаму паслу

**Савет Міністраў падвысіў службовыя аклады паслоў Беларусі ў замежных краінах.**

Цяперашнія аклады паслоў Рэспублікі Беларусі:

Аўстрыйская Рэспубліка — 21900 аўстрыйскіх шылінгаў

Рэспубліка Баўгарыя — 1000 USD

Каралеўства Бэльгія — 49300 бэльгійскіх франкаў

Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірляндыі — 865 ангельскіх фунтаў

Фэдэратыўная Рэспубліка Германія — 3100 нямецкіх марак

Злучаныя Штаты Амэрыкі — 1600 USD

Дзяржава Ізраіль — 1600 USD

Італьянская Рэспубліка — 1320 USD

Кітайская Народная Рэспубліка — 1040 USD

Латвійская Рэспубліка — 800 USD

Літоўская Рэспубліка — 750 USD

Каралеўства Нідэрлянды — 2896 нідэрляндзкіх гульдэнаў

Рэспубліка Польшча — 1200 USD

Румынія — 700 USD

Украіна — 400 USD

Француская Рэспубліка — 9500 францускіх франкаў

Швайцарская Канфэдэрацыя — 2600 швайцарскіх франкаў

Эстонская Рэспубліка — 800 USD

## Сёньня

Сяргей ДУБАВЕЦ

# Шаладонаўскія яблыкі

Экс-міністар аховы краю Літвы А.Буткявічус дзьве гадзіны выступаў у прыватным тэлеканале. Гісторыя, якую ён распавядаў, перапынялася кадрамі прэс-канфэрэнцыі расейскага міністра абароны П.Грачова ў Калінінградзе. А сутнасьць гісторыі ў наступным.

Прыватная ковенская фірма «Селма» будуе ў Калінінградзе цэлыя кварталы жытла для расейскіх вайскоўцаў, якіх выводзяць з Прыбалтыкі. Расплочваецца Расея бартэрна — зброяй і нафтай. Зброю «Селма» прадае Міністэрству аховы краю Літвы. Коштамі, тэмпамі й надзейнасьцю кантрактаў задаволеныя ўсе бакі. Пра гэта і хацеў сказаць П.Грачоў дырэктару «Селмы» В.Лаўрынавічусу ў Калінінградзе, але — вось тут пачынаецца гісторыя — у дзень прыезду Грачова В.Лаўрынавічуса арыштавалі. Сустрэча не адбылася. Напэўна, гэта непаразуменьне, — выказаў сваю думку Грачоў, — бо ані прэзыдэнт, ані прэм'ер Літвы санкцыяў на арышт не давалі. Але цяпер з прыпыненьнем будаўніцтва жытла прыпыніцца і вывад расейскіх войскаў з Латвіі ды Эстоніі. А добрыя дачыненьні паміж Расеяй і Літвой пагоршацца.

Хто ж арыштаваў дырэктара «Селмы»? Хто так неабдумана хоча пасварыць Літву зь ейнымі балтыйскімі суседзямі і самой Расеяй? — пытаецца экс-міністар Буткявічус. Санкцыю на арышт з уласнай ініцыятывы выдала Генэральная пракуратура Літвы, якою кіруе А.Паўлаўскас. У яго свае крымінальныя матывы. Афіцыйнаю прычынаю арышту сталі два кіляграмы тратылу, знойдзеныя дома ў дырэктара «Селмы». Падстава быццам сур'ёзная, але непараўнальная з палітычнымі наступствамі для Літвы, Балтыі і ўсяго рэгіёну. Таму Буткявічус разглядае палітычны аспэкт дзейнасьці Генпракуратуры. Першае, што яму згадваецца, — эпізод з выдачай Літве двух лідараў падпольнай літоўскай кампартыі. Гэта была зьдзелка двух пракурораў: беларускага ды літоўскага. А.Паўлаўскас забраў у Шаладонава двух пярэстаркаў, назваўшы іх арганізатарамі путчу (хоць якія яны арганізатары, — ускліквае Буткявічус, — мы ж ведаем, што ўсё арганізоўвалася ў Маскве!), і зноў палітычныя наступствы аказаліся непараўнальныя — на Беларусі зьнялі двух міністраў і сьпікера-дэмакрата.

Такім чынам, з гэтых двух эпізодаў ужо вымалёўваецца кантэкст рэальнага палітычнага жыцьця рэгіёну і тыпалёгія наступных падзеяў. Шэрыя кардыналы ў постсавецкіх краінах сядзяць па лініі пракуратуры (Буткявічус мяркуе, што канец гэтай лініі трэба шукаць у Маскве). У патрэбны, добра прадуманы момант праводзіцца добра прадуманы арышт, у выніку якога адбываюцца палітычныя перастаноўкі. Усё, як кажуць, «схвачана».

Ня ведаю, ці будзе Васіль Шаладонаў выстаўляцца на прэзыдэнта, але ў пэўным сэнсе ён і так прэзыдэнт. Пасьля выдачы літоўскіх бальшавікоў усе ведалі, хто аддаў загад, але зьнялі хутчэй «галаву дзяржавы», чым яго, вінаватага. Пры гэткай беспакаранасьці можна меркаваць, што сёньняшнія арышты — гэта толькі «цьвяточкі», будуць яшчэ і яблыкі.



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Сяргей НАВУМЧЫК

# Залежная прэса — фактар грамадзкай рызыкі



**Сяргей Навумчык, 32 гады, з адукацыі — журналіст. Дэпутат Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Беларусі.**

Адным зь першых крокаў маладога польскага прэм'ер-міністра было запрашэньне на пасаду прэсавага сакратара ўраду чароўнай дзяўчыны, дарэчы, уладальніцы тытулу «Miss Polonia». Ня буду кранаць іншых аспэктаў дзейнасьці гэтага прэм'ера, але цяпер брыфінгі ды прэсавыя канфэрэнцыі ўраду зьбіраюць максымальную колькасьць журналістаў. Прынамсі, мужчынская палова прадстаўнікоў прэсы, як мне казалі, пачала наведваць урадавы прэс-цэнтар значна часьцей.

Няма сумневу, што, прызначаючы свайго новага прэс-сакратара, Вячаслаў Кебіч таксама дбаў найперш пра ўласны імідж. І калі ў мяне пытаюцца, ці не спадар Данілаў падсунуў Кебічу палкоўніка Замяталіна — я заўсёды адказваю: ні ў якім разе. Гэта, безумоўна, быў сьведамы выбар Вячаслава Францавіча. Магчыма, вынік не адной бяссоннай ночы. «Всем вышел» новы прэс-сакратар: і пагоны на плячах, і па-беларуску не выступае. Але галоўнае — здольны расставіць журналістаў па ранжыру. Я проста не ўяўляю сабе іншага рэпрэзэнтанта для прэм'ера, які не саромецца сарваць воплескі заявай пра тое, што будзе «кіраваць прэсай». І ўжо падчас першага зьяўленьня на тэлеэкране Замяталін творча разьвіў устаноўкі свайго патрона, паабяцаўшы для пачатку навесьці парадак з акрэдытацыяй замежных журналістаў.

Апэратыўнасьць, зь якой кіраўніцтва Міністэрства замежных справаў пачало «наводзіць парадак», пацьвярджае: з надыходам прэзыдэнцкае кампаніі сыстэма «кіраваньня прэсай» збояў даваць ня будзе. Бо калі адзіны рэальны вынік дзейнасьці ўраду — эканамічны крызыс на мяжы каляпсу, то самаю галоўнаю мэтаю якраз і робіцца стварэньне прывабнага іміджу.

Дзесяцігодзьдзямі гэты імідж, акрамя мясцовай прэсы, стваралі карэспандэнты тагачасных «цэнтральных» выданьняў. За сваю працу яны мелі шыкоўныя кватэры, рэгулярныя замежныя паездкі і, у выпадку адданага служэньня, — пэрспэктыву «кадравага росту». Можна назваць літаральна некалькі імёнаў — Сяргей Ваганаў ды Анатоль Казловіч — зь ліку тых, хто знаходзіўся ў стане пэрманэнтнага канфлікту з кіраўніцтвам ЦК.

Прыход Рамана Якаўлеўскага ў «Постфактум», Аляксандра Старыкевіча ў «Известия» і Леаніда Сьвірыдава ў РТВ заканамерны: як бы там ні было, маскоўская прэса працуе ва ўмовах рынкавай канкурэнцыі, і, адпаведна, там зьмяніліся крытэрыі прафэсійнага майстэрства. Нікога ўжо не цікавяць рэпартажы пра «зярняткі перадавога досьведу» ў «самай стабільнай рэспубліцы». Але гэтыя журналісты — галаўны боль для кіроўцаў саўмінаўскай прапагандавай машыны. Кажуць, што рухавікі для танкаў зьбіраюць у супэрстэрыльных умовах. Бо чым лепей адладжаныя шасьцерні ў мэханізьме, тым больш небясьпечнае зьяўленьне ў ім хай нават адной пяшчынкі.

Таму ня трэба дзівіцца, што МЗС адмовіла ў акрэдытацыі новаму карэспандэнту «Известий». Хоць гэта і пахне міжнародным скандалам. Але ж ці можа наш урад без скандалаў? Да таго ж, уплыў маскоўскай прэсы на сьведамасьць грамадзянаў Беларусі па-ранейшаму застаецца надта моцны, каб яго можна было ігнараваць напярэдадні выбарчай кампаніі. Урад нічога не зрабіў, каб сродкі масавай інфармацыі Беларусі склалі канкурэнцыю маскоўскім. Мяркую, што цяпер спадар Кебіч вельмі шкадуе пра гэта.

Але рэзэрвы яшчэ ёсьць — і штомесяц «Советская Белоруссия», «Рэспубліка», «Сельская газета» атрымоўваюць шматмільённыя датацыі зь дзяржаўнага бюджэту. І ня трэба нашым дэмакратам спадзявацца, што ў нейкі момант з прычыны дэфіцыту гэтага самага бюджэту ўрад будзе вымушаны спыніць фінансаваньне ўласных газэт. Спадар Кебіч хутчэй перакрые крэдыты БелАЗу і трактарнаму заводу, чымся згубіць «Советскую Белоруссию».

Акрамя прапагандавай абслугі ўраду, афіцыйнаму друку прадпісана выконваць і яшчэ адну, ня менш важную для гэтага ўраду функцыю. Гэтая функцыя цалкам адпавядае стратэгічнаму кірунку дзейнасьці Савету Міністраў. Я маю на ўвазе сьціраньне ў грамадзкай сьведамасьці паняцьця «незалежная Беларусь».

Ці чулі вы калі-небудзь з вуснаў спадара Кебіча, ягоных намесьнікаў, прадстаўнікоў камуністычнай парляманцкай бальшыні такое слова — краіна? У дачыненьні не да Францыі ці Буркіна-Фасо, а да Беларусі? Я — ніколі ня чуў.

«Сытуацыя ўскладняецца тым, што рэзка падвысіўся масавы вываз хлеба за межы рэспублікі, бо скарацілася яго вытворчасьць у суседніх дзяржавах» (віцэ-прэм'ер Сяргей Лінг, цытата з паведамленьня Белінфарма, «Зьвязда», 18 сакавіка сёлета). Беларусь для іх — заўсёды — рэспубліка ў складзе дзяржавы са сталіцай Масква.

Днямі кіраўнікі «Останкино» рэкамэндавалі сваім дыктарам больш не ўжываць слова Беларусь, а казаць — Белоруссия. Пераканаwны, што спадар Сталяроў рэкамэндаваў тэле- і радыёжурналістам не ўжываць у дачыненьні да Беларусі выраз «краіна».

Заўсёды дзіўлюся, як віртуозна на дзяржаўным радыё вядзецца прапаганда супраць дзяржаўнай мовы. У інфармацыйнай праграме кажуць пра гаротны стан дзіцячага дома, затым — пра дэфіцыт лекаў у шпіталях. А потым адразу — што на абсталяваньне кабінэтаў для вывучэньня беларускай мовы выдаткавана гэтулькі і гэтулькі грошай. І зноў — інтэрвію з вэтэранам, якому не хапае пэнсіі, каб паехаць у санаторыю. Матэрыял падабраны такім чынам, што ў слухача на ўзроўні падсьведамасьці ("ці туды трэба ўкладаць грошы?") нараджаецца настрой варожасьці. Пяць такіх прыёмчыкаў — і слухач пераканаwны, што ўсе нашыя беды — ад «белорусификации, которую насильственно насаждают националисты».

Пра катэджы коштам у дзясяткі тысячаў даляраў, якія «насаждают» у прыгарадных зонах сабе ды сваім блізкім кіраўнічыя «интернационалисты», у гэтых праграмах, вядома ж, ня ўзгадваецца.

Зрэшты, абалваньваньне грамадзянаў — істотная частка дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі.

Вось уявіце на імгненьне, каб выпуск навінаў CNN пачаўся з колькіхвіліннага сюжэту пра тое, што ў штаце Алябама на фэрме Біла Джонса ўсё падрыхтавана да веснавой сяўбы. Гэта само сабой зразумела, што ў Біла будзе ўсё падрыхтавана і да сяўбы, і да жніва. Ці ўявіце рэпартаж пра тое, што ў Майкла з Каліфорніі добра дояцца каровы (зрэшты, карова мае шанец трапіць у выпуск нават перад сюжэтам пра выступ прэс-сакратара Белага Дома — у тым выпадку, калі яна ацялілася — ну, ня ведаю, мо дваццацьцю цялятамі адразу).

Калі ж у Біла ці ў Майкла трактары зламаныя, каровы стаяць галодныя, увогуле непарадак на фэрме — дык гэта іхныя ўласныя праблемы. Тэлегледачу яны абсалютна не цікавыя, бо ўсё роўна а восьмай раніцы ў крамах ці то Кліўленда, ці то Нью-Ёрка зьявяцца сьвежае малако й парное мяса. Сыстэма рынкавай эканомікі працуе як гадзіньнік. Яна можа спатыкнуцца толькі з прычыны недасканалай падатковай палітыкі, на якую ўплываюць кангрэс, сэнат і прэзыдэнт. І вось калі раптам такое здараецца, і дзясяткі тысячаў Майклаў і Білаў разараюцца ўшчэнт — вось тады тэлекамэнтатар «прыціскае да сьцяны» міністра сельскай гаспадаркі ці старшыню сэнацкай камісіі, альбо, пад час прэсавай канфэрэнцыі, і самога прэзыдэнта. І ў эфір ідзе жорсткі, бязьлітасны камэнтар. Вельмі кароткі — сэкундаў на сорак — але такі, што сэнатар альбо міністар і праз месяц не супакояцца, а Білу (таму, што зь Белага Дома) увечары будзе не да саксафона.

І мне зусім нецікава глядзець, як там у калгасе «Ленінскае шчасьце» шукаюць кармоў для скаціны. Калі вас ужо зацікавіла праблема кармоў, дык распавядзіце, куды кіраўнік міністэрства хлебапрадуктаў падзеў сотні тысяч даляраў, прызначаныя на закуп збожжа. Для большага эфэкту можна даць гэты тэкст на фоне інтэр'ераў офіса ягонага сынка, які браў удзел у зьдзелцы. Ці запытайцеся ў віцебскага пракурора, як гэта ён прагледзеў мільярд, падараваны ў 1992 г. на мэты закупу зерня фактычна неіснуючым фірмам. І калі наступнай раніцай міністэрскі бонза ня будзе звольнены і, пры патрэбе, адпраўлены пад суд — увечары заявіце, што трэба ў карак гнаць прэм'ера, які трывае такіх падначаленых.

Тэкст пра прэм'ера можна прачытаць на фоне цялушак, што стаяць па вымя ў гноі.

Гэтак ці прыблізна гэтак было б зроблена ў цывілізаваным сьвеце. Кіраўнікі беларускага тэлебачаньня й рэпартэры цяпер багата езьдзяць па замежжы ды, вядома ж, цудоўна ведаюць, як трэба здымаць.

Але каб так здымаць, ані шэфы тэлекампаніі, ані журналісты не павінны залежаць ад таго ж прэм'ера ці ягоных прэс-сакратароў.

Супрацоўнікі афіцыйных тэлерадыёкампаніяў ды выданьняў цяпер, здаецца, вельмі задаволеныя сваім лёсам. Становішча карэспандэнта «Белінфарма» больш стабільнае, чым рэпартэра «БелаПАНа», а аглядальнік «Знамени юности» пачуваецца значна лепей, чым камэнтатар «Свабоды». Як у той песьні — «товарищ Сталин думает о нас». Але ж так будзе не заўсёды. Дзяржаўныя мільёны — як наркотык, іх зьнікненьне прывядзе да надзвычай балючай «ломкі». Афіцыйную прэсу можа напаткаць лёс стратных дзяржаўных прадпрыемстваў, якія прызвычаіліся спадзявацца на дзяржплянснабаўскую сыстэму.

Здаецца, сёй-той у прасаўмінаўскім друку гэта пачынае разумець. І прапанаваная апазыцыяй праграма рэарганізацыі сыстэмы сродкаў інфармацыі, якая летась выклікала зьедлівыя камэнтары, цяпер ужо ўспрымаецца як рэальная. Даходы ад рэклямы пераконваюць рэдакцыйныя калектывы, што задавальняць інтарэсы соцень тысяч падпісчыкаў можа і ў фінансавым сэнсе быць значна выгадней, чымся служыць двум дзясяткам чыноўнікаў. На жаль, гэтае разуменьне прыйшло запозьнена — акурат перад выбарамі, калі чыноўнікам трэба навязаць падпісчыкам інтарэсы сваёй касты.

Свабодная прэса, ці, як яе яшчэ называюць, чацьвертая ўлада — сродак грамадзкага кантролю за функцыяваньнем трох астатніх уладаў — заканадаўчай, выканаўчай і судовай. Свабодная прэса спрыяе ўсталяваньню гарманічных, збалянсаваных дачыненьняў і ў грамадстве — паміж сацыяльнымі групамі й палітычнымі рухамі. Калі гэты балянс парушаецца, узьнікае небясьпека сацыяльных катаклізмаў. Таму сытуацыя, у якой сродкі масавай інфармацыі падначаленыя дзяржаўным, установам — небясьпечная для самой дзяржавы.

Хаця на Беларусі якраз зьнішчэньне дзяржавы зрабілася галоўнаю мэтаю гэтых установаў.

---

**Людзі году**

## *Алег Мінкін*
## *Мікола Статкевіч*





**Штогод напярэдадні 25 Сакавіка Беларускі гуманітарны адукацыйна-культурны цэнтар вызначае ляўрэатаў свае ўласнае прэміі.**

Сёлета прэміяй «За літаратурную дзейнасьць» уганараваны 42-гадовы паэт і перакладнік Алег Мінкін, а прэміяй «За грамадзкую чыннасьць» — лідар забароненага БЗВ 37-гадовы Мікола Статкевіч. Ляўрэаты, падобна як Нобэлеўскія, маюць права выступіць зь лекцыяй у Ліцэі пры БГАКЦ.

Паводле палажэньня, прэмія БГАКЦ уяўляе сабою найбуйнейшую на момант уручэньня беларускую грашовую купюру (цяпер гэта 1000, то бок 10000, .бел.руб.).



© PDF: Kamunikat.org 2010

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Гэта тыя самыя злодзеі

Гэты ліст піша вам былы жыхар Беларусі. У 1951 г. усю нашую сям'ю (4 чалавекі) вывезьлі ў Сібір, на голад і холад, за тое, што бацька й сястра былі вернікамі. Мы жылі ў вёсцы Замошша Іванаўскага раёну Берасьцейскай вобласьці. У нас забралі хату, карову, каня — усё. Зь Беларусі разам з намі гналі ў Сібір 4 эшалёны бязьвінных людзей. Некаторыя не даехалі, памерлі па дарозе. З нас зьдзекаваліся як маглі.

Пасьля сьмерці Сталіна нас зьнялі з камэндатуры, і я паехаў на радзіму. Знайшоў сабе працу ў Кобрыні — кавалём на інструмэнтальным заводзе. Пасяліўся на прыватнай кватэры. Але калі прыйшоў у міліцыю прапісвацца, дык там «чырвоны голуб міру» зірнуў мой пашпарт і зароў як мядзьведзь: «Едзь туды, адкуль прыехаў, а то мы цябе самі адвязем туды, дзе белага сьвету не пабачыш!» Вось якая гэта была ўлада!

Я паехаў. Сяк-так зачаліўся на чужой зямлі, на Ўкраіне. У 1992 г. я пачаў зьвяртацца ў Берасьце і Менск, каб вярнулі сканфіскаваную ў нас маёмасьць. Мне адказалі, што няма ніякіх дакумантаў пра нашае высяленьне, пра забраную маёмасьць. Я ім напісаў: ёсьць сьведкі, жывыя людзі ў вёсцы Замошша — яны пацьвердзяць. Адказваюць: нічога ня хочам ведаць, у нас няма дакумантаў, калі хочаце — можам выплаціць 15 тыс. рублёў. Зьдзек! За гэта можна было тады купіць толькі кірзавыя боты й целагрэйку. Я адмовіўся ад іхнай міласьціны. Я зразумеў, што цяперашнія ўлады таксама нічога ня хочуць прызнаваць, а хочуць толькі схаваць злачынствы камуністычнай імпэрыі. Яны аднаго поля ягады.

Дарагія беларусы! Ня верце сваім сёньняшнім уладам. Змагайцеся за свае правы, свае звычаі. Яднайцеся між сабою, інакш яны зноў вас перасадзяць. Ня верце ім, бо гэта тыя самыя злодзеі, якія прапілі нашае дабро.

Жыве свабодная незалежная Беларусь!

**Васіль ДОЎГЕР**

Валынская вобл.
г.Рожышча

# Беларускія памежнікі затрымалі летувіскага грамадзяніна за тое, што размаўляў па-беларуску

28 лютага я быў у Менску зь інтэрасам. Залатвіўшы свае справы, вечаровым дызэлем таго самага дня варачаўся дахаты ў Вільню. Безь ніякіх прыгодаў даехаў да Гудагаю і ўжо думаў, што гадзіны за дзьве буду дома рыхтавацца да сну. Але ж дзе там!.. Гудагай ёсьць апошняй станцыяй на беларускім баку перад беларуска-летувіскай мяжой. Дзеля гэтага цягнік у Гудагаі даволі доўга стаіць, а мытнікі й памежнікі спраўджаюць багаж і дакуманты людзей, якія гэтым цягніком маюцца ехаць далей у Летуву.

Мне праз сваё жыцьцё дзяржаўную мяжу рожных краінаў нямала разоў даводзілася пераяжджаць. Калісьці, болей за дзесяць гадоў таму, пераяжджаў савецка-польскую мяжу, а ўжо за часоў СНД пераяжджаў і летувіска-латыскую, і латыска-расейскую, і латыска-эстонскую, і расейска-казаскую, і казаска-туркмэнскую, і туркмэнска-ўзбэцкую. І памятаю, што польскія памежнікі размаўлялі па-польску, эстонскія па-эстонску, расейскія па-расейску, а ўзбэцкія па-ўзбэцку. Натуральная зьява, скажаце, што за дзіва. І я так думаў. Але ж вось беларускія памежнікі на беларускай станцыі Гудагай на гэты конт іначай думаюць.

Калі яны зайшлі ў вагон, то папрывіталася і па-расейску папрасілі паказаць пашпарты. Я памеркаваў: я ж беларус, знаходжуся на Беларусі, дзе дзяржаўнай мовай ёсьць мова беларуская, і як да мяне надышоў чарод паказваць свой пашпарт, то папрасіў беларускага памежніка, каб ён выказаў мне сваю просьбу па-беларуску. Паны беларускія памежнікі з гэткага майго пажаданьня вельмі зьдзівіліся і просьбу да мяне паказаць пашпарт паўтарылі на расейскай мове. Я падумаў, што, можа, яны мяне не зразумелі, і яшчэ раз папрасіў, каб яны загаварылі да мяне па-беларуску. Тут яны ўжо шчыра абурыліся. Адзін схапіў мяне за грудкі: «Да я цебя січас...» Але другі сказаў, што яшчэ трэба скончыць спраўджваць пашпарты, а «с эцім гражданінам патом разбіромся».

Пайшлі яны. Хвілінаў за дзесяць вараціліся і ўсё паўтарылася: яны да мяне па-расейску, а я папрасіў, каб яны да мяне па-беларуску. Кажу: «Няўжо цяжка колькі словаў сказаць па-беларуску?» Яны кажуць, што ежалі пашпарт не пакажаш, то высадзім з вагона. Кажу: «Я ж не адмаўляюся паказаць, але ж папрасеце гэта зрабіць па-беларуску». Тады яны ўзялі мяне з двух бакоў пад рукі й вывелі з вагона. Завялі мяне ў сваё памешканьне. Аднаго памежніка пакінулі разам са мною, наказаўшы глядзець, каб я ня ўцёк. Сказалі, што здадуць мяне міліцыі.

Запраўды, праз колькі часу прыехаў міліцыянт. Адвялі мяне ў нейкі пакой на станцыі Гудагай і там разам зь ім пакінулі. Міліцыянт паглядзеў мае дакуманты й пацікавіўся, што сталася, чаго мяне высадзілі з вагона. Я, кажу, хацеў, каб беларускія памежнікі загаварылі да мяне па-беларуску. Ён кажа, што я ня надта маю рацыі, бо, маўляў, сярод памежнікаў ёсьць нямала людзей, якія паходзяць з Расеі і мовы беларускай ня ведаюць, і, значыцца, зь імі трэба гаварыць па-расейску. Дзякаваць Богу, думаю, што сярод іх няма кітайцаў або, скажам, туркаў, бо тады, мусіць, празь дзяржаўную мяжу Беларусі ніводзін чалавек, апроч кітайцаў з туркамі, не пераехаў бы. Адвёў міліцыянт мяне зноў да памежнікаў. Сказаў ім, што пашпарт мой у парадку, жыву я ў Вільні й маю летувіскае грамадзянства, а што са мной рабіць — хай паны памежнікі думаюць. Тады адзін зь іх кажа на мяне: «Еслі он, б... , такой умны, б... , то пускай сідзіт тут, на... , да утра, б... Утрам вызавім літовскіх пагранічнікаў. Пускай ані ему, б... , бакі атаб'ют, на...». Міліцыянт дадаў, што так і трэба, і пайшоў.

Такім вось чынам мусіў я праз усю ноч прасядзець на крэсьле ў памешканьні памежнікаў, дзе насупраць мяне на сьцяне вісеў герб Пагоня, а пад ім стаяў бел-чырвона-белы сьцяг...

Раніцай мне сказалі, што зараз прыедзе іхны зьверхнік і ён будзе думаць, што са мной рабіць: ці здаваць летувіскім памежнікам, ці можа, пашкадаваўшы, адпусьціць так, бо летувіскія памежнікі, маўляў, вельмі злыя, і будзь пэўны, бакі табе добра адаб'юць. Прыехаў зьверхнік, адвялі мяне да яго ў пакой. Ён пытае, чаму я не падпарадкоўваюся памежнікам і адмаўляюся паказваць ім свой пашпарт. Я, кажу, не адмаўляюся, толькі хачу, каб яны да мяне па-беларуску гаварылі. Няўжо, кажу, ім цяжка колькі словаў сказаць па-беларуску. Ён кажа, што цяжка, і пастанавіў перадаць мяне летувіскім памежнікам. Напісаў пратакол. Тут якраз ранішні дызэль на Вільню пад'ехаў. Адвёў мяне гэты зьверхнік у дызэль, а пашпарт мой і пратакол аб затрыманьні аддаў машыністаму, наказаўшы перадаць летувіскім памежнікам. Мне сказаў, што ў Кене яны мяне спаткаюць, ён затэлефанаваў.

Летувіскія памежнікі ў Кене паглядзелі мой пашпарт, пачыталі пратакол. Пытаюцца, дзеля чаго цябе затрымалі? Кажу, што хацеў, каб беларускія памежнікі загаварылі да мяне па-беларуску. Яны кажуць, што добра зрабіў, пасьмяяліся, паспачувалі мне. Запыталіся, ці ня білі мяне беларускія памежнікі? Не, кажу. Пашэнціла табе, кажуць. Аддалі мне мой пашпарт і адпусьцілі. Тым самым ранішнім дызэлем даехаў я да Вільні.

Як сядзеў уночы ў памешканьні беларускіх памежнікаў, то разгаварыліся зь імі. Як высьветлілася, бальшыня іх, а таксама іхны зьверхнік — беларусы. Такія вось справы.

**Ян МЯТЛЕЎСКІ**

Вільня

# Мясьніковічы не бянтэжацца...

Прачытала ў вашай газэце (№8) пра тое, што першы намесьнік прэм'ер-міністра М.Мясьніковіч стаў кандыдатам эканамічных навук, абараніўшы дысэртацыю на тэму «Ўмовы й фактары станаўленьня рынкавай эканомікі».

Ня ведаю, што тав. Мясьніковіч напісаў у дысэртацыі, а практычную ягоную дзейнасьць бачыць кожны: адсутнасьць рынкавых рэформаў, бездапаможнасьць і бязьдзейнасьць нашага ўраду. Як другая асоба ў гэтым урадзе, Мясьніковіч цалкам адказны за крах беларускай эканомікі. Аднак, відаць, яго ўсё гэта ня надта бянтэжыць. Дык, можа, больш справядліва было б пайсьці ў «творчы адпачынак» і рухаць эканамічныя рэформы на паперы?

З павагаю да вашай газэты
**А.І.СТРУКАВА**

Менск



**У Жыткавіцкім райвыканкаме зьмены...**

# І суд не дапамог...

Калісьці, за хрушчоўскім часам, крытыка была ў пашане. Ня тое, што цяпер. Успамінаю такі выпадак. У 50-я гады я вучыўся на філфаку Берасьцейскага пэдінстытуту. На канікулы прыяжджаў да бацькоў у родную вёску Доўгая Івацэвіцкага раёну. Там зь землякамі ў сельскім клюбе глядзеў фільмы, якія прывозілі зь мястэчка Быцень разам з кінаапаратурай. Каня й фурманку даваў тутэйшы калгас «Краіна Саветаў». За гэта старшыня гаспадаркі Іван Горбік прыдбаў сабе і ўсёй сваёй сям'і льготу: ён, ягоная жонка й дзеці глядзелі фільмы бясплатна. А безграшовыя калгасьнікі, студэнты й школьнікі мусілі купляць білеты.

Гэта абурала маіх землякоў. Але ўсе баяліся выказаць абурэньне ўголас. Я не пабаяўся і напісаў крытычную нататку ў берасьцейскую абласную газэту «Зара». У вёсцы прачыталі газэту і ад душы рагаталі.

Калі б гэта было цяпер, старшыня калгасу, пэўна, падаў бы ў суд «за паклёп», знайшоў бы сьведкаў, што я нахлусіў, і мне ўляпілі б штраф, які давялося б доўга пагашаць.

Тады кіраўнік калгасу зрабіў інакш. Ён наагул перастаў наведваць кіно, гэтаксама — ягоная жонка й дзеці. А майму бацьку, які працаваў у калгасе, сталі вылучаць на пасадку бульбы і для нарыхтоўкі сена самыя горшыя надзелы.

— Гэта старшыня аддзячыў яму за страчанае бясплатнае кіно, — пасьмейваліся вяскоўцы.

А цяпер прыклад зь сёньняшняга жыцьця.

13 сакавіка 1993 г. ў газэце «Зьвязда» жыхар вёскі Чудзенічы Лагойскага раёну М.Яўмененка, дарэчы, актывіст БНФ, зьмясьціў у нізцы лістоў невялічкі допіс. Там старшыня праўленьня мясцовага калгасу «Ніва» В.Раманоўскі крытыкаваўся за безгаспадарлівасьць, няўвагу, грубасьць да калгасьнікаў і надзвычайны клопат пра дачнікаў, што добра прыжыліся тут. Кіраўнік гаспадаркі палічыў сябе абражаным, падаў пазоў ў суд Лагойскага раёну.

Суд быў на баку старшыні гаспадаркі. М.Яўмененку прысудзілі заплаціць 50 тысяч рублёў за нанесеныя таму маральныя страты і за «сфабрыкаваны паклёп». Суды вышэйшых інстанцыяў прызналі рашэньне лагойскага суда законным.

Пад рубрыкай «З залы суда» лагойская раённая газэта «Родны край» апублікавала матар'ял «У што абышоўся паклёп», які напісала народны лаўнік (засядацель) Т.Рудак (яна ж — супрацоўніца газэты). Там выкрываўся «паклёпнік» М.Яўмененка.

Рашэньне суда абурыла мясцовы люд. У інстанцыі паляцелі калектыўныя скаргі калгасьнікаў на старшыню. Адзін зь лістоў, дзе стаяла 83 подпісы, абмяркоўваўся на адкрытым справаздачным сходзе ў канцы студзеня 1994 г. у Чудзенічах. Сход калгасьнікаў падтрымаў аўтараў ліста. Вырашылі дэталёва заслухаць старшыню і правесьці ягоныя перавыбары. Людзі гаварылі, што В.Раманоўскі сапраўды «заваліў гаспадарку», больш турбаваўся пра дачнікаў, чымся пра калгасьнікаў, якімі кіраваў 5 гадоў. Адкрытым галасаваньнем выбралі новага старшыню — Б.Трайкоўскага, які дагэтуль працаваў у раённай управе сельскай гаспадаркі.

Раённая газэта друкуе цяпер інтэрвію з новым старшынёю, апісвае цяжкі стан калгасу «Ніва»... Але ні слова ня піша пра тое, што першым выклікаў агонь на сябе сябар БНФ Мікалай Яўмененка, за што ад мясцовых уладаў і народнага суда атрымаў ярлык паклёпніка.

**Мікалай ПЯТРОЎСКІ**

Лагойск



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Эстонія: шлях да рэформаў

**Чатыры гады ўрад Кебіча шукае «свой шлях» рэформаў. Будуюцца нейкія паветраныя палацы і адна за другою зацьвярджаюцца «праграмы рэформаў»... Яны баяцца зірнуць далей уласнага носу, прыглядзецца да суседзяў, у якіх рэформы «пайшлі» і даюць добры плён. Адна з такіх краінаў — маленькая Эстонія.**

Напрыканцы 1991 г. там была сытуацыя, горшая ад нашай. Масква рэзка падвысіла эстонцам кошты на энэрганосьбіты. На працягу трох месяцаў яны вырасьлі ў 100 разоў. Гэта пацягнула за сабою інфляцыю, якая перавышала 1000% (кіраўніцтва Беларусі тады пахвалялася «стабільнасьцяй» нашай эканомікі). У выніку ўведзеных абмежаваньняў і падвышэньня цэнаў аб'ём апэрацыяў экспарту ды імпарту адразу зьменшыўся ўтрая.

Зіма 1992 году была вельмі цяжкім выпрабаваньнем. Пастаўкі нафты па трубах з Расеі зьменшыліся, трэба было шукаць іншыя крыніцы. У порт падышлі два танкеры з мазутаю, але з-за нізкай тэмпэратуры немагчыма было перапампаваць яе — застывала у трубах. Тады было вырашана падаграваць мазуту на танкерах і такім чынам удалося яе перапампаваць. Хаця тэмпэратура ў кватэрах была ўдвая ніжэйшая, чым звычайна ў гэты ж пэрыяд, але пеpазімавалі. За зіму быў пабудаваны тэрмінал, каб прымаць буйныя марскія танкеры.

Эстонскі ўрад ня трэба было прысьпешваць на рэформы. Адразу ж лібэралізавалі цэны, адмянілі ўсе датацыі (захаваліся толькі датацыі грамадзкаму транспарту і на аплату жытла насельніцтву).

Наступным крокам было ўвядзеньне нацыянальнай валюты. Выбралі даволі спрыяльны момант — расейскі рубель на працягу некалькіх месяцаў у стасунку да даляра знаходзіўся ў раўнавазе, ня падаў. 20 чэрвеня 1992 г. з 4-х гадзінаў раніцы пачалі працаваць абменныя пункты, дзе грамадзяне маглі памяняць наяўныя рублі на кроны паводле курсу 10 руб.=1 кроне да 1500 рублёў на 1 асобу, а калі звыш 1500 рублёў, то 50 руб.=1 кроне. Да абеду фактычна ўсе мелі на руках сваю валюту.

Курс кроны быў зьнітаваны зь нямецкаю маркаю (8 кронаў=1 марка). Вызначылі мяжу ў 1000 DM для вывазу замежнай валюты без дэклараваньня. Прадпрыемствам тады забаранілі мець валютныя рахункі ў банках. Але цяпер усе абмежаваньні зьнятыя.

Зьмянілі падаткавае заканадаўства. Для збалянсаваньня бюджэту прыйшлося падвысіць стаўку падатку з авароту амаль удвая (але цяпер яна ўсё роўна на 2 пункты меншая, чым у нас). Потым замест падатку з авароту перайшлі да падатку на дададную вартасьць. Увялі ўнівэрсальны падаходны падатак (зь юрыдычных і фізычных асобаў). Гэтыя два падаткі даюць 80% паступленьняў у бюджэт. Дарэчы, важная асаблівасьць, якую варта было б пераняць нам: у Эстоніі пераразьмяркоўваецца праз бюджэт толькі 40% нацыянальнага даходу (у нас звыш 60%).

Эстонцы цалкам лібэралізавалі вонкавы гандаль, толькі на ўвоз аўтамабіляў зьбіраюць мыта 10%. І, як ні дзіўна, гандлёвы балянс у іх зьвіхтаваны. А аплатны балянс мае станоўчае сальда (за кошт паслугаў марскога флёту). Зьмены, што адбыліся ў вонкавым гандлі, відавочныя. Калі ў 1991 г. 95% усяго тавараздвароту прыходзілася на Расею, то цяпер найважнейшы гандлёвы партнэр Эстоніі — Фінляндыя, доля якой у экспарце на 21% большая, у імпарце на 20% большая, чым аналягічныя паказьнікі гандлю з Расеяй. Эстонія шырокім крокам выходзіць на сусьветныя рынкі: у 1992 г. у параўнаньні з 1991 экспарт і імпарт павялічыліся ў 10 разоў; толькі ў першым паўгодзьдзі 1993 г. экспарт склаў 77%, а імпарт 87% гадавых паказьнікаў за 1992 г.

Цікавы момант. Эстонія зусім не вырабляе аўтамабіляў. Тым ня менш у структуры імпарту з Расеі за 1-е паўгодзьдзе 1993 г. аўтамабілі склалі 12,3%, а экспарт аўтамабіляў у Расею — 30,2%. Гэта ў пэўнай ступені ілюструе характэрны працэс: у Эстоніі адбылася замена парку аўтамабіляў савецкай вытворчасьці больш эканамічнымі заходнімі, часам не зусім новымі, але паводле парамэтраў лепшымі за аналягічныя савецкія. Савецкія ж аўтамабілі былі прададзеныя ў Расею.

Дзіўным здаецца на першы позірк і тое, што спажываньне паліва ў Эстоніі зьменшылася ў 5 (!) разоў. Але ўсё становіцца зразумела, калі мы ў суму памяншэньня ўлучым патрэбы савецкага войска і флёту.

Сытуацыя ў эканоміцы стабілізуецца. Пасьля ўвядзеньня валюты інфляцыя спачатку складала больш як 30% у месяц, цяпер яна не перавышае 5% у месяц. Расьце вытворчасьць, хаця зусім нядаўна, паводле афіцыйных зьвестак, яе падзеньне склала 70% (у нас у студзені 1994 г. у параўнаньні са студзенем 1991 г. вытворчасьць упала на 56%). Асабліва высокімі тэмпамі ў Эстоніі разьвіваецца абсяг паслугаў. У Таліне практычна не адчуваецца беспрацоўя.

Бохан хлеба ў Эстоніі каштуе, як і літар бэнзыну — 25 цэнтаў. Мінімальная заработная плата складае 300 кронаў. Сярэдняя — у 4 разы вышэйшая. Трэба адзначыць вялікую дыфэрэнцыяцыю даходаў насельніцтва. Але асноўная маса (зьвесткі за 1992 — 1 пал. 1993 г.) — 60% мела даход ад 4800 да 13200 кронаў у год на сям'ю; ад 25000 да 33500 кронаў — толькі 6% насельніцтва.

Дзякуючы рашучасьці Эстонія здолела прайсьці пік крызысу. Эстонская валюта больш устойлівая за швэдзкую й фінскую. Эстонскую крону ахвотна каціруюць банкі эўрапейскіх краінаў (але не Расеі, што тлумачыцца найперш палітычнымі прычынамі). Золатавалютныя рэзэрвы Цэнтральнага банку Эстоніі за два гады павялічыліся ў 5 разоў.

Эстонія выбрала найбольш рацыянальны з эканамічнага гледзішча шлях прыватызацыі — продаж прадпрыемстваў і фондаў (гэта дадатковы чыньнік устойлівасьці валюты).

Вынікі рэформаў у Эстоніі, з аднаго боку, натхняюць нас, беларусаў, але з другога — наганяюць страху, бо дзейнасьць цяперашняга нашага ўраду сьведчыць, што ці наўрад у бліжэйшыя 5 гадоў мы дагонім Эстонію.

**Андрусь ДЫЛЮК**




**1991 г. Эстонцы пікетуюць савецкую авіяцыйную базу**
*Здымак Тоні Энэмара (Швэцыя)*

# Баўгарыя: цяжкая пагоня за тым, што ўжо было

Калі з 1996 году баўгарская эканоміка будзе разьвівацца ў тэмпе 4% штогод, то ў 2006 годзе яна дасягне ўзроўню 1988-90 гг. Пра гэта гаворыцца ў дакладзе, падрыхтаваным экспэртамі Інстытуту эканомікі пры Баўгарскай Акадэміі навук.

Паводле бальшыні паказьнікаў эканамічнага разьвіцьця Баўгарыя займае адно з двух апошніх мейсцаў ува Ўсходняй Эўропе.

### Сумныя лічбы

Падзеньне нацыянальнага даходу на працягу апошніх чатырох гадоў нагадвала сытуацыю ў Румыніі і было меншае толькі за адпаведны паказьнік у Альбаніі, краінах былой Югаславіі ды былога СССР. Але, адрозна ад Альбаніі, эканамічнаму спаду ў Баўгарыі не відаць канца. Беспрацоўе дасягнула 17,1%, што ставіць Баўгарыю на малапрэстыжнае першае мейсца, гэтаксама як і дэфіцыт бюджэту, які склаў у 1993 г. 11,8% нацыянальнага даходу. Агульную карціну дапаўняюць: найвышэйшы спад у замежным гандлі — 52,4% за пэрыяд 1989—92, найменшы працэнт занятых у прыватным сэктары і другое з канца (перад Альбаніяй) мейсца паводле велічыні замежных інвэстыцыяў.

Карціна баўгарскай эканомікі, якая вынікае з памянёнага дакладу, болей пэсымістычная за пададзеную ў ацэнцы экспэртаў МВФ. Нягледзячы на чатыры гады рэформаў, эканоміка яшчэ далёкая ад стабілізацыі. Для працы ўраду характэрны недахоп каардынацыі між паасобнымі кірункамі эканамічнае палітыкі. Рэформы праводзяцца запозьнена, а фінансавая сыстэма служыць хутчэй сама сабе, чым гаспадарцы. Інфляцыя, якая ў 1990-91 гг. выклікала празьмерны попыт, цяпер спараджаецца абмежаванаю прапановаю.

### Кошт санкцыяў

Адна з асноўных прычынаў кепскага становішча баўгарскай эканомікі, апрача чыньнікаў, тыповых для ўсіх краінаў Усходняй Эўропы, — гэта санкцыі ААН супраць суседняй Сэрбіі ды Іраку, якія раней былі важнымі гандлёвымі партнэрамі гэтай краіны. Суцешыць баўгараў можа толькі цьверджаньне экспэртаў Інстытуту Эканомікі, што сытуацыя ў іхнай краіне ўсё яшчэ лепшая, чым у Альбаніі, былым СССР і большай частцы Югаславіі, а таксама перакананасьць шэфа Нацыянальнага банку Баўгарыі ў тым, што падпісаньне сёлета пагадненьняў з МВФ і прыватнымі крэдыторамі будзе пачаткам паляпшэньня.

### Спробы ратунку

Баўгарскі парлямант нядаўна прыняў закон аб усеагульнай прыватызацыі, на падставе якога кожны пааўналетні грамадзянін краіны, што стала жыве ў Баўгарыі, атрымае каштоўныя паперы на 25 тыс. леваў (690 даляраў). Баўгары атрымаюць кніжачкі зь пяцьцю талёнамі, якія можна памяняць на акцыі прызначаных урадам да прыватызацыі прадпрыемстваў або інвэстыцыйных фондаў. Паводле ўрадавай праграмы прадбачыцца прыватызацыя 500 прадпрыемстваў. Ува ўсеагульнай прыватызацыі маюць права ўзяць удзел 5,8 млн. баўгарскіх грамадзянаў. Паводле папярэдніх ацэнак урадавых экспэртаў, з гэтага права скарыстае 4 млн. чалавек.

Перавагу пры атрыманьні акцыяў маюць работнікі прадпрыемстваў, вызначаных да прыватызацыі, якія адпрацавалі там болей за два гады, а таксама асобы, якія ўзялі ў арэнду пэўны аб'ект.

**Падрыхтаваў Вінцук ШОСТКА**

# Беларусь: павольныя крокі наперад

**Менавіта так называецца вялікі аглядны матар'ял пра нашую краіну, які зьявіўся ў нядаўным нумары францускага эканамічнага часопіса «Le MOCI». Аўтар артыкула Фрэдэрык Манян паспрабаваў адхінуць заслону невядомасьці й загадкавасьці з аблічча Беларусі.**

Аўтар мяркуе, што на тле вайсковых канфліктаў у Нагорным Карабаху, Таджыкістане ды Грузіі і спрэчак пра флёт паміж Расеяй ды Украінай «самая заходняя з рэспублік былога СССР» выглядае стабільна й спакойна. Аднак мірны характар Беларусі не прынес ёй славы. «Гэтая краіна, — піша Манян, — прысутнічае ў памяці некаторых францускіх гісторыкаў толькі таму, што там цячэ Бярэзіна». У Францыі мала хто ведае нават пра тое, што Беларусь больш за ўсіх пацярпела ад чарнобыльскай катастрофы.

Каб прыцягнуць увагу францускіх бізнэсмэнаў да новай краіны на Ўсходзе, Гандлёва-прамысловая палата Парыжа і Цэнтар інфармацыі пра міжнародныя рэаліі правялі сэмінар, прысьвечаны Беларусі. На сэмінары выступіў мэсьё Бэрнар Дагўаса, эканамічны дарадца пасольства Францыі ў Беларусі, які сказаў літаральна наступнае: «Можна задаваць сабе пытаньні наконт таго, існуе беларуская нацыя або не, але нельга сумнявацца ў існаваньні беларускай эканамічнай прасторы. Беларускія прадпрыемствы болей не атрымліваюць загадаў з Масквы».

Гэтае выказваньне выдатна характарызуе стаўленьне францускіх афіцыйных колаў да нашай краіны: маўляў, «мы ня ўпэўненыя, што яны народ, але глупствам было б ня выкарыстаць такі зручны трамплін для экспансіі на Ўсход». Дзеля справядлівасьці варта ўсё ж адзначыць, што мэсьё Дагўаса зрабіў крок наперад у параўнаньні са сваёй суайчыньніцай акадэмікам мадам д'Анкос, якая ў скандальным артыкуле ў газэце «Le Figaro» бязь ценю сумневу аспрэчвала існаваньне якіх-кольвечы нацыянальных адметнасьцяў нашага народу (пра гэта раней пісалася ў СВАБОДЗЕ).

Але вернемся да артыкула. На згаданым сэмінары быў дадзены аналіз эканамічнага становішча на Беларусі. У ім зазначаецца, што «палітычны ды эканамічны кансэрватызм уладаў выяўляецца ў млявасьці заканатворчай дзейнасьці. Заканадаўчы падмурак, неабходны для ўсталяваньня рынкавай эканомікі, яшчэ далёкі ад сфармаваньня».

Тым ня менш аўтар матар'ялу Фрэдэрык Манян выказвае надзею, што Францыя, якая пакуль што займае 20-е мейсца сярод замежных партнэраў Беларусі, неўзабаве палепшыць пазыцыі на нашым рынку. Што ж, справа добрая, але хацелася б бачыць больш разуменьня з францускага боку да нашых імкненьняў жыць у незалежнай, абноўленай Беларусі.

**Падрыхтаваў Віктар ЛУК'ЯНАЎ**



© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

